Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# Ці ведаем мы Беларусь?
(дыдактычная гульня)

Молчан Таццяна Аляксандраўна,
выхавальнік дашкольнай установы
без кваліфікацыйнай катэгорыі

аг. Грыцкевічы, 2022

Узрост: выхаванцы 4-5, 5-6 гадоў.

Дыдактычная гульня «Чацвёрты лішні»

Для дзяцей 5-6 год

Мэта: фарміраванне ўяўленняў аб культурных каштоўнасцях беларускага народа, традыцыях, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве праз азнаямленне з беларускай лялькай.

Дыдактычны матэрыял: карткі з выявай прадметных карцінак.

Гульнявыя дзеянні: аб'ядноўваць прадметныя карцінкі па сэнсе ў групу і суадносіць з беларускай лялькай, называць яе.

ХОД ГУЛЬНІ

- Дзеці, на картцы вы бачыце 4 карцінкі. Назавіце кожную карцінку і вызначыце, якая з іх лішняя, растлумачце чаму. Выхавальнік дапаўняе адказы выхаванцаў.

Дыдактычная гульня «Гатуем беларускія стравы»

Для дзяцей 4-6 гадоў

Мэта: фармаванне грамадзянскай ідэнтычнасці выхаванцаў шляхам азнаямлення з беларускай кухняй у працэсе гульнявой дзейнасці.

Дыдактычны матэрыял: карцінкі з выявай прадуктаў харчавання, збанкі з надпісамі вітамінаў, карткі для запаўнення.

Гульнявыя дзеянні: У пачатку гульні праводзіцца гутарка. Дзеці адказваюць на пытанні: Якую гародніну вы ведаеце? З чаго вараць боршч "Беларускі"? Якую садавіну вы ведаеце? Якія вітаміны яны змяшчаюць? Як вы думаеце, з чаго вараць кісель? Дзе можна ўзяць гародніну і садавіну? Якія стравы беларускай нацыянальнай кухні вы ведаеце? Калі дзеці не могуць адказаць, дарослы дапамагае наваднымі пытаннямі. Гуляць выхаванцы могуць як індывідуальна, так і калектыўна.

ХОД ГУЛЬНІ

Гульня-спаборніцтва паміж двума выхаванцамі ці двума камандамі. Адна каманда будзе варыць боршч "Беларускі", другая - кісель (бульбяную бабку з грыбамі і да т.п.). Перад кожнай камандай размешчана магнітная дошка, на якой на адлегласці адна ад адной прымацаваны посуд для прыгатавання той ці іншай беларускай нацыянальнай стравы. Побач размешчаны карцінкі з выявай прадуктаў харчавання. Выхаванцы пасля сігналу па чарзе адзін за адным збіраюць неабходныя для гатавання той ці іншай стравы. Перамагае тая каманда, якая хутчэй і больш правільна справіцца з заданнем.

Дыдактычная гульня «Беларускія народныя промыслы»

Для дзяцей 4-5 год

Мэта: фарміраванне ўяўленняў аб народных промыслах Рэспублікі Беларусь.

Дыдактычны матэрыял: 5 канвертаў з карцінкамі, разрэзанымі на 6 частак, з выявай народных промыслаў Рэспублікі Беларусь, магнітная дошка.

Гульнявыя дзеянні: удзельнікі гульні атрымліваюць па адным канверце; збіраюць сваю карцінку на магнітнай дошцы і расказваюць пра яе.

ХОД ГУЛЬНІ

Дарослы прапануе сабраць карцінку і расказаць аб тым промысле, які на ёй намаляваны, дапамагае выхаванцам, калі яны адчуваюць цяжкасці, задае выхаванцам ўдакладняючыя пытанні

Дыдактычная гульня "Беларускія святы і традыцыі"

Для дзяцей ад 4 да 5 год

Мэта: фарміраванне ўяўленняў аб народных святах і традыцыях беларускага народа

Дыдактычны матэрыял: канверты з заданнем, карцінкі з выявай народных свят і атрыбутаў да іх, рознакаляровыя кубікі-пазлы з выявай фрагментаў народных свят.

Гульнявыя дзеянні:

Варыянт 1. Выхаванец выбірае адну з карцінак, на якой намалявана нацыянальнае свята. З прапанаваных варыянтаў атрыбутаў або характэрных для абранага свята дзеянняў, падбірае карцінкі да адпаведнага свята, якія з'яўляюцца неад'емным яго складнікам (свята Масленіца – карцінка з выявай бліноў, збанок з мёдам, падпаленае пудзіла і інш.).

Варыянт 2. Выхаванцы складаюць з кубікаў-пазлаў (чатыры кубікі) цэлую карціну, якая паказвае тое ці іншае нацыянальнае свята.

ХОД ГУЛЬНІ

Дарослы раздае кожнаму выхаванцы карцінку з выявай свята. На стале раскладзены карцінкі-атрыбуты, характэрныя для вызначанага свята. Кожны з выхаванцаў па чарзе выцягвае карцінку з атрыбутам і тлумачыць, што на ёй намалявана і да якога свята адносіцца. Калі скончацца ўсе карткі і атрымаецца цэлая карцінка, выхаванцам расказваюць аб традыцыі святкавання.